# Вочы зямлі: святыя крыніцы Беларусі

**Шанаванне крыніц на беларускай зямлі мае даўнія і трывалыя карані. Перакананасць у тым, што вада з іх дае людзям бадзёрасць і сілу, чысціню і здароўе, спалучалася з міфалагічнымі ўяўленнямі аб надзвычайных уласцівасцях самога воднага аб'екта.**



**Таццяна Валодзіна,**
загадчык аддзела фальклярыстыкі і культуры славянскіх народаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, доктар філалагічных навук, прафесар



**«Крынічка Магдалена,
стаіш па калена,
дарую я цябе
хлебам і соллю,
надары рабую кароўку
добрым здароўем,
жоўтым маслам,
белым сырам».**

Святая крыніца ў Клімавіцкім р-не

На тэрыторыі нашай краіны налічваецца некалькі сотняў такіх крыніц, і да большасці з іх захоўваецца паважлівае стаўленне. Не менш за сотню з іх не проста прыцягваюць да сябе чысцюткай вадой, але і лічацца асаблівымі, цудадзейнымі. Нездарма самай пашыранай назвай такіх крыніц стала азначэнне «святая». Слава пра асобныя з іх, як, напрыклад, пра Сіні калодзеж ля в. Кліны Слаўгарадскага р-на, які зараз называюць Блакітнай крыніцай, разыйшлася нават за межы краіны. Сотні людзей збіраюцца ўшанаваць Чарневіцкую крыніцу ў Глыбоцкім р-не, Ільінку ва Ушацкім і інш. Але большасць культавых крыніц – гэта «мясцовыя» святыні для жыхароў вёскі (мястэчка) і ваколіцаў, што зусім не азначае нібыта меншы ўзровень святасці. Для «сваіх» такі куток валодае асаблівай сілай і прыцягальнасцю, гэта безумоўны цэнтр сакральнага жыцця ваколіц. Зусім не істотна, што такіх нават у адным раёне магло быць некалькі: для вяскоўцаў менавіта «свая крыніца» была і ёсць самай галоўнай і дарагой. У 2016 г. аўтар разам з даследчыкам Уладзімірам Лобачам напісалі кнігу «Святыя крыніцы Беларусі», якая стала вынікам доўгіх экспедыцыйных даследаванняў і змяшчае шмат фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, фотаздымкаў з усіх рэгіёнаў рэспублікі.

Пра тое, што нашы продкі зусім не абыякава ставіліся да крыніц, мы можам даведацца яшчэ з прац нашага славутага земляка, асветніка і святара Кірылы Тураўскага аж з XI ст. Праўда, у сваіх прапаведзях ён з асуджэннем узгадваў ахвяраванні, тым самым зрабіўшы акцэнт на вельмі істотным моманце шанавання. Характар рытуальных дзеянняў ля культавых аб'ектаў мае ў аснове прынцып дараабмену, калі атрыманне «долі» (здароўя) у выглядзе «святой вады» прадугледжвала ахвяру (дар) з боку чалавека. «І рушнічок там, ездзім мы і на Ушэсце ілі як Раданіца, дык там дрэвы і рушнічок хто павесе, хто дзенежак, хто канфетачак. Гавоpуць, як з крыніцы вадзіцу нада браць, нада купіць вадзічку, палажыць нада дзенежку» (в. Палядкі Краснапольскага р-на). У дадзеным артыкуле скарыстоўваюцца палявыя запісы аўтара апошніх гадоў. Усе яны захоўваюцца ў Калекцыі фальклорных запісаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.

Гэты прынцып абмену дарамі знайшоў адлюстраванне ў беларускай замоўнай традыцыі:

*«Крынічка Магдалена,*
*стаіш па калена,*
*дарую я цябе хлебам і соллю,*
*надары рабую кароўку*
*добрым здароўем,*
*жоўтым маслам,*
*белым сырам».*

Найчасцей у якасці прынашэнняў фігуруюць тэкстыль (ручнікі, палатно) і грошы (манеты). Калі раней прыносілі і павязвалі ля крыніц тканыя рушнікі, сёння паўсюль можна бачыць каляровыя стужкі. Па адшуканых манетках можна вызначыць часавую глыбіню іх наведвання.

Шанаванне крыніцы абумоўлена найперш чысцінёй і празрыстасцю яе вады, якая стаіць доўга, не псуецца, захоўваючы свае фізічныя ўласцівасці. Да таго ж многія з нас назіралі і дзівіліся ключам, што бесперапынна б'юць з зямлі, і сцюдзёнай вадзе, што цячэ, цячэ і цячэ. Як сімвал вечнага руху яна ўвасобіла ў сабе значэнне самога жыцця. Невыпадкова выраз «Будзь здаровы, як вада» – гэта эталоннае пажаданне здароўя. Прынцыпова важны для асэнсавання міфалагічнай сімволікі крыніцы ў традыцыйнай карціне свету і вектар яе руху, адрозны звыкламу, – ключ б'е знізу ўверх, з падзем'я – на паверхню, і яго вада ўвасабляе маладосць і здароўе як квінтэсэнцыю жыцця. Паказальныя дыялектныя назвы, зафіксаваныя на Гомельшчыне, – «жывец, жыўчык». Да ўсяго дадавалася і здольнасць крыніцы не замярзаць зімой і не перасыхаць улетку.

Разам з тым сімвалічнае яе значэнне абапіраецца на міфалогію самой вады як вытворнай і бясконца важнай стыхіі. Чалавек і сам складаецца з яе на вялікі адсотак, зародак ва ўлонні маці знаходзіцца ў вадкасці. Як сам свет паўстае з іх сярод пракаветнага акіяну, так і дзіця прыходзіць на зямлю разам з матчынымі каляплоднымі водамі. Хутчэй за ўсё, якраз эмбрыялагічныя працэсы і падштурхнулі да разумення вады як мяжы паміж светамі. Менавіта праз яе, згодна з народнымі ўяўленнямі, можна трапіць на той свет ці з яго прыйсці ў наш. Крынічкі ў полі сваіх міфалагічных значэнняў і захавалі выразнае разуменне іх як непасрэдных каналаў сувязі з навакольным асяроддзем, прычым у яго розных вымярэннях, ад боскіх вышыняў да дэманічных прадонняў.

Адметная геамарфалогія і тапаграфія ўласна водных аб'ектаў паўплывалі на іх сакралізацыю. Семіятычна важкай адзнакай стаюць іх гукавыя характарыстыкі, што можа атрымліваць увасабленне і на ўзроўні найменняў – «Грымячка», «Бразгун», «Равучы калодзеж». Гукавую вылучанасць крыніцы ў навакольнай прасторы можна параўнаць з царкоўным звонам, які дазваляе выявіць і знайсці на слых сакральны цэнтр, святыню. Але, у адрозненне ад перазвону, які можна пачуць толькі з пэўнай нагоды, крыніцы

заяўляюць пра сябе пастаянна. Акрамя таго, прыцягвалі яны да сябе ў аддаленых, нібыта не прызначаных для з'яўлення ключоў месцах, – на гары ці пад гарой, сярод балота, глыбока ў лесе. Адметнасцю можа стаць наяўнасць некалькіх ключоў-ручайкоў, як каскад у Быхаўскім р-не, дзе вада збягае з розных месцаў і ўтварае адзін ручай, ці Байковы крыніцы ў Чавускім р-не. Крыніца На крыжах у в. Заслонава Лепельскага р-на – прыклад такой незвычайнай прыроднай святыні: 4 крынічкі зліваюцца разам, утвараючы крыж.

На тэрыторыі Беларусі найбольш пашыраны тры тыпы найменняў культавых водных аб'ектаў: крыніца, ключ, калодзеж. Іх культавы статус прадугледжвае падтрыманне ўпарадкаванасці, рэгулярнае наведванне і захаванне легенды і часам мае гісторыю аб паходжанні ці асаблівай гаючай моцы вады. Міфалагічны прэцэдэнт (праява боскага (святога) персанажа ці аб'екта ля (на месцы) крыніцы, цудадзейнае выздараўленне хворага), зафіксаваны ў паданнях, апелюе да «даўніх-прадаўніх» часоў і асаблівым чынам вылучае месца аб'яўлення боскай сілы. Летапісы пра надзвычайнае паходжанне святых крыніц можна падзяліць на некалькі тыпаў, згодна з асноўнымі сюжэтнымі лініямі, якія могуць мець мноства каларытных мясцовых дэталяў.

Асобную групу складаюць паданні, дзе ўзнікненне святых крыніц звязана са знікненнем (правалам пад зямлю) культавых аб'ектаў – храмаў і капліц. Ключы, як і шэраг азёраў ці пагоркаў, з'яўляюцца на месцы колішняй святыні, але, у адрозненне ад іх, не проста маркіруюць «святое месца», але сваёй вадой увасабляюць і перадаюць сакральную энергію ў свет людзей. Наступны блок сакралізацыі крыніцы – гэта з'яўленне ля яе іконы, шанаванага абраза. Кожнаму беларусу знаёмы аповед пра ікону Жыровіцкай Божай маці, якая з'явілася на грушцы, з-пад якой заструменіла крынічка. Гэтае месца знаходзіцца пад храмам Жыровіцкага манастыра. У Веткаўскім р-не памятаюць: «У нас жа ў Шарсціне ёсць святыісточнік. Там была старынная цэркаў і там служыў Іаан Кармянскі Гашкевіч. Ён пашоў на святыісточнік, а там ляжыць ікона Параскевы Пятніцы. Ён за эту ікону і прынёс у храм. Назаўтра прашоў, апяць іконы няма, пашоў наісточнік, а яна там ляжыць. І на трэці дзень так. Хацеў эту ікону забраць, а яна яму: "Не бяры мяне, я далжна быць на этым істочніку. І далжна памагаць людзям"» (в. Пыхань). Асобнае месца займаюць паданні, дзе цудадзейную крыніцу знаходзяць хатнія жывёлы. Сюжэты падобнага роду маюць вельмі архаічную аснову, бо свойская жывёла выступае своеасаблівым пасярэднікам паміж светам культуры і прыроды, чалавекам і боскай сферай светабудовы. Гэткім незвычайным чынам быў дадзены знак людзям пра святую ваду ў ваколіцах Бягомля Докшыцкага р-на.

Але самым пашыраным застаецца сюжэт пра выяўлены кімсьці лекавы характар крынічнай вады. Звычайна размова ідзе пра цудоўнае вяртанне зроку сляпым. Нехта бачыць у сне, які з'яўляецца каналам сустрэчы светаў, што яму трэба пайсці ў лес, знайсці там крынічку і памыць вочы. Самая знакамітая гісторыя пра такое дзівоснае ацаленне звязаная са святой крыніцай Пустынкаўскага Свята-Успенскага манастыра ў Мсціслаўскім р-не. Князю Лугвенію-Сімеону, сыну Альгерда, у сне з'явіўся старац, які


Байковы крыніцы, Чавускі р-н


Святая крыніца ля в. Слабада, Веткаўскі р-н

загадаў ісці ў пустынь і памыць вочы ў крыніцы. Князь так і зрабіў – адразу сышла цемень з вачэй, і ён стаў бачыць. А побач у галлі цяністай ліпы чакаў ячшэ адзін цуд – абраз Божай маці. Удзячны князь загадаў узвесці там капліцу, а затым і манастыр.

У паданнях пра паходжанне святых крыніц прысутнічае асобны матыў цудоўнай метамарфозы, калі па волі Бога ў крыніцу ператвараецца чалавек. Так, з'яўленне і надзвычайныя ўласцівасці Дзявочых калодзежаў ля в. Жыхары і Янчыкава Полацкага р-на звязваюцца мясцовым насельніцтвам з вобразам дзяўчыны, што ўцякала ад салдатаў-пераследнікаў і, абы не трапіць ім у рукі, праvalілася скрозь зямлю. Устойлівасць і разам з тым арганічнасць апісаных суадносінаў добра ілюструе заўвага Марыі Румянцавай з в. Пачапы Краснапольскага р-на пра тое, што любая крыніца ўзнікае з дзяўчыны. «Дык эта ўцікала дзеўка, ганяўся хлопец за ёй, яна ўцікала. Уцікала: "Луччы я стану крыніцай, чым жыць і з табой неўдаліцай". І ссунулася тут і стала крыніцай. – Гэта пра якую крыніцу? – Пра любую, айдзе крыніца. Пра любую крыніцу». Існуе паказальны запіс з Веткаўскага р-на: «Там сенакосы Ігнацёнкавы былі. Крыніца была. Каля яе куст быў. Трава кругом і кусты. Жэншчына жала і зжала той куст. І ёй рэч атабрала. І праснілася ёй крыніца і кажа: "Нашто ты маю касу абрэзала?"» (в. Казацкія Балсуны). Спецыфіку Пасожжа складаюць аброчныя крыніцы – культавыя аб'екты, якія сталі шанаванымі з боку людзей у памяць пра пераадоленне пэўнага крытычнага моманту быцця (засуха, трагічная сітуацыя ў часе вайны), што пагражаў дабрабыту ці нават жыццю ўсяго вясковага калектыву. Як правіла, у выпадку хваробы, засухі і/ці іншай навалы жанчыны, часцей удовы, радзей мужчыны чысцілі ключ, рабілі зрубчык, стаўлялі крыж, вешалі аброчны тэкстыль. Да гэтага часу парадкуюць і даглядаюць крынічку і як аброк пры хваробах. «У мяне во дажа дачка аброчная. Дужа хварэла, мы абракнуліся, дзень раждзенія ей атмецілі, 7 гадоў, сабралі людзей. І тады іконку паняслі на крынічку, я навышыла, матка абнясла» (в. Бабічы Чачэрскага р-на).

Сёння значная частка святых крыніц уключана ў сістэму народна-рэлігійных практык і знаходзіцца пад патранажам царквы, пераважна праваслаўнай. Апеляцыя да хрысціянскіх падзей можа адбівацца на ўзроўні назвы воднага аб'екта. Напрыклад, у Чашніцкім р-не шанаваная крынічка так і называецца – Ізус («Можа, Ісус тую ваду асвяціў»), у Сенненскім – Русалім, у Лепельскім – Пад Богам. Таксама існуе шэраг ключоў у гонар розных святых – Барыса-Глебская, Мікольская, Пяцінка. Ля іх, згодна з паданнямі, нярэдкія сустрэчы з Божай Маці, зафіксаваны пэўныя замовы: «На іянскай гарэ, на шаўковай траве Хрыстос росу збіраў, з крынічкі воду браў. Сядай, Хрыстос, за стол, бяры ключы ў прыпол, замкні ведзьмам, і ведзьмарам, і ведзьмаратам губы, зубы, рот» (в. Малы Бокаў Мазырскага р-на).

Звычайна ля воднага аб'екта ставяць крыж, сёння пашыраная (хоць і далёка не апраўданая) практыка ўзводзіць капліцы з купелямі. Культурная фармалізацыя некананічнай, з гледзішча афіцыйнай царквы, народнай святыні легітымізуе яе ў вачах хрысціянскіх святароў, што, у сваю чаргу, толькі ўзмацняе яе сакральны статус ва ўяўленнях вернікаў – прадстаўнікоў


Крыніца Бердыж, Чачэрскі р-н


Крыніца Сядзельнікі, Мазырскі р-н

мясцовай супольнасці. Гэта ідэальна адпавядае зместу і форме народнага хрысціянства: калі ўшаноўваюць крыніцу, але моляцца да Бога.

У міфапаэтычнай карціне свету, дзе ўсе прадметы, рэчы, з'явы навакольнага свету надзяляліся чалавечымі характарыстыкамі і ўласцівасцямі, крыніцы таксама ўяўляліся жывымі істотамі з уласнай воляй, рысамі і норавамі рэальных людзей, якія могуць крыўдаваць, быць лагоднымі, патрабаваць да сябе належнага стаўлення і павагі. Перш за ўсё гэта тычыцца самастойнасці ў абранні сабе рэчышча, імкненні да свабоды і нежаданні цалкам падпарадкоўвацца волі чалавека.

Крыніцы, як і ўсе прыродныя месцы (лес, возера, рака), паводле перакanання прадстаўнікоў традыцыі, вельмі чуллівыя да паводзінаў людзей і рэагуюць адпаведным чынам на іх добрыя, паважлівыя ці благія ўчынкі. У Веткаўскім р-не запісаны пакаазальныя гісторыі, калі крыніцы могуць залюбіць, крыўдаваць ці нават помсціць за знявагу сваёй чысціні.

У асобных раёнах традыцыя ўшанавання вымагала перыядычнай расчысткі воднага аб'екта з захаваннем, аднак, даволі жорсткіх сімвалічных патрабаванняў. Удзел у рытуальна значнай аперацыі могуць прымаць толькі жанчыны, што абумоўлена міфалагічнай суаднесенасцю стыхіі вады менавіта з жаночым пачаткам. Пры гэтым маюцца на ўвазе «чыстыя» катэгорыі: цнатлівая дзяўчына, кабета, якая ўжо выйшла з дзетароднага ўзросту, удава. Акрамя таго, любая з іх павінна вылучацца і маральнай чысцінёй у межах вясковага калектыву. У адваротным выпадку, калі прадпісанне было парушана, крыніца магла «пакрыўдзіцца» і схаваць на пэўны час сваю ваду. У прыватнасці, гэта было характэрна для традыцыі ўшанавання Барыса-Глебскай крыніцы на Шклоўшчыне: «Я восем лет лазіла сюда чысціць і не балела. Там вада ледзяная. А адзін раз як Аксана пачысціла, маладая дзяўчына, мы яе загналі туды, яна пачысціла, празнік прышоў, а вады і няма. Мы думалі, яна харошая, з мужам разыйшлася, не гуляе... Нада чысціць, хто не ругаецца, і ўдава».

У пасожскіх вераваннях культавае месца рэагавала на ўдзел у рытуальных практыках «нячэснай» дзяўчыны тым, што пачынаў рыпець абраз: «І калі эту ікону куды-та бралі вынасілі. І возьмуць дзевачкі несці яе, маладыя дзевачкі. І як возьмець дзевачка, каторая ўжо ня дзевачка, пальчычак во так прітoрня, і яна ўжо скріп, скріп. А яны нясуць этыя дзеўкі і думаюць: "Хто ж плахей между нас". А яна ж ня можаць адкінуць рукі, совесна ж ей. Ты ж ужо ня дзеўка – не бяріся» (в. Курбакі Краснапольскага р-на). Неабходнасць захоўваць асабістую, маральную чысціню ва ўзаемадачыненнях са святой вадой была настолькі моцнай, што чалавек, які ўсведамляў уласную недасканаласць, пазбягаў удзелу ў добраўпарадкаванні культавага месца.

Варта разумець, што крыніца як прадметнае ўвасабленне воднай стыхіі, гэтаксама як і ўласна вада, характарызуецца амбівалентнасцю ў традыцыйнай карціне свету. Пазітыўныя значэнні, суаднесеныя з ідэяй жыцця, безумоўна прэвалююць, але падземнае (хтанічнае) паходжанне крыніцы ляжыць у аснове яе суаднясення ў фальклоры з рознымі міфалагічнымі персанажамі. У Краснапольскім р-не апавядаюць пра з'яўленне ля ключа нябачных гаспадароў навакольнай прасторы – палевікоў ці іх дзіцяці. У гэтым выпадку адметна рэалізуецца вядомы сюжэт пра знаходку голенькага немаўляці, за апрананне якога чалавек атрымлівае ад духа падарунак.

«У нас на Вішневецкай ёсць крыніца. Там ключы б'юць, паставілі кальцо. Расказвалі, ішла жэншчына, і плача малыш, на крыніцы там. Яна яго ўзяла і прынесла дамой. Адзела яго і тады не несла, а хазяін гаворя: "Занясі малога адзе брала". Дык ноччы насіла да крыніцы і палажыла на места. А ўтрам хадзіла, а не было ні младзенца, нічога. Эта быў хазяінаў. Можа і палявога. Во кальцо, а там жа лавачка. Ён жа не на зямле ляжаў, а на лавачке. Яна пажалела малога. І тады прішоў к ёй і гаворя: "Занясі назад". Адзела і занясла назад палажыла» (в. Палядкі Краснапольскага р-на).

Сімвалічнае паяднанне крыніцы і русалкі гэтаксама падаецца вытлумачальным з прычыны прысутнасці «воднага» кампанента ў партрэце персанажа народнага падання. Універсальным выступае і матыў часання валасоў міфічнай дзяўчынай менавіта ля вады: «Гарадок ё, там была крыніца, і вот эта Паша вышла ўтрам рана на Івана Варэніка і вот стала глядзела на эту кріпіцу і гаворя: "Вот вышла дзеўка, маладая, у плацці красівым, у белам ува ўсім". І тады яна, гаворя, паглядзела, паглядзела, і тады яна ўродзе туды прыгнула, знікла і ўсё. Гарадок у нас завецца, там русалку і бачыла. Пахадзіла, пахадзіла там і знікла» (в. Васькавічы Слаўгарадскага р-на).

«Раньшы гаварілі, што ў Клінах якій-та ішоў мужчына. Іду, гаворя, а каля кріпіцы сядзіць дзеўка і чэша касу. Як толькі дайшоў да яе, яна гаворя: "Эх, добры чалавек, не даў ты мне

касу расчасаць”. Боўць у ваду і пашла. І гаварілі, што ўкінулася было бряўно ў крініцу і крініца эта заліла Кліны, дзяреўню ўсю. І ніхто яго ня мог выцягнуць. А эты мужчына, каторы яе бачыў, пашоў і выцягнуў бряўно і вада стала на места. А Бог яго ведае» (в. Каменка Слаўгарадскага р-на).

Такой суаднесенасці крыніцы з засветамі ў многім паспрыялі ўяўленні пра яе прынцыповую бяздоннасць, наўпроставую лучнасць з прадоннем. Пра Сіні калодзеж на мяжы Веткаўскага р-на з Браншчынай кажуць, што ён «усяленна глыбокі».

Святая крыніца, дзе на нас сыходзіць Божая ласка, – у той жа час месца сустрэчы з самымі living рознымі дэманалагічнымі персанажамі: дабрахожымі, русалкай. Можа, хтосьці бачыць тут супярэчнасць, але яе насамрэч няма. Вада, крыніца – месца, дзе сустракаюцца два светы, наш і «той», прадстаўлены самымі living рознымі істотамі – ад русалкі да Божай Маці.

У асобных выпадках водны аб’ект, які ўяўляе сабой канал камунікацыі з тагасветам, выступае не толькі як месца чысціні і сілы (здароўя), але і як «крыніца ведаў». Пры гэтым маюцца на ўвазе веды эзатэрычныя, знахарскія, авалодаць якімі могуць толькі абраныя людзі і толькі ў пэўных умовах і абставінах. Сустракаюцца аповеды, калі падкрэслена ля крыніцы адбывалася перадача ведаў або – што асабліва цікава – ля святой вады шаптуха ўзгадвала пераданыя ў раннім дзяцінстве тэксты замоў. І сёння раяць да знахара па лекаванне адпраўляцца з крынічнай вадой. Яна ўспрымаецца як моцны прафілактычны сродак пры самых розных захворваннях і наогул як моцны танізуючы напой.

Рытуальнае ўшанаванне крыніцы можа насіць калектыўны характар і мець строгае суаднясенне з канкрэтным святам народнага календара. Пісьмовыя звесткі і матэрыялы палявых даследаванняў даюць інфармацыю аб пэўнай прымеркаванасці наведвання людзьмі вялікай колькасці крыніц. Калектыўныя паломніцтвы і зараз прымяркоўваюцца да абсалютнай большасці святаў хрысціянскага календара – Вадохрышча, Юр’я веснавога, Міколы веснавога, Вялікадня, Ушэсця, Тройцы, Яна, Пятра і Паўла, Іллі, Барыса і Глеба, Макавея, Прачыстай, Узвіжання. Прызначанасць наведванняў крыніц да святаў велікоднага цыкла нячастая, але традыцыя насіць туды яйкі гаворыць аб наўпроставай уключанасці святога месца ў вясковую культурную прастору, кожны складнік і ўдзельнік якой абавязкова далучаліся да сакральнасці падзей. У большасці гэтых выпадкаў ля крыніц адбывалася царкоўная служба, вада асвячалася і такім чынам яе сакральны статус аднаўляўся і замацоўваўся ў межах бягучага года.

Калектыўныя шэсці вылучаюцца строгім, падкрэслена ўрачыстым характарам. Вось як узгадваюць колішнія выправы да крыніцы ў Слаўгарадскім р-не:

«І тады ўсе старушкі, і нашы, і з іншых вёсак, прібяруцца, у вузялочак завяжуць ці яечка, ці што, усё няслі к этай Іванавай крінічкі. Там стаяў бальшы хрест. Насілі туды і палаценцы, у каго што было. Народу было очань многа, і там маліліся Богу. І была баба Веряб’іха, яна прінасіла бальшую ікону. А ікона была, вот раскрывалася як кніга. Ета бабка прінасіла ікону, закрытую набожнікам, каля етае іконы маліліся Богу. А калі ўжо пройдзе этае служэніе, усе на каленках, і мы, дзеці, на каленкі станавіліся. І тады бабка эта закрывала іконку. І тады так на траву длінна-длінна людзі ўсе рассаджаваліся, і скацерці не слалі, проста на траву, у каго што было, усе клалі на эту траву і тады такі абед. І мы, дзеці, ніхто не возьме, пакуль нам не разрешаць, ці моркавінку, ці яблычка, усё няслі. Усё паабедаюць. А што астанецца, дзіцям раздадуць» (в. Зарэчча Слаўгарадскага р-на).

Цікава, што ахвяраванне крыніцы магло ўваходзіць і ў склад вясельнага абраду. У Чачэрскім р-не «на свадзьбе, як былі калісьці крыніцы, маладая насіла на крыніцу булачку. Назаўтра свой піражок, што з жаніхом яны мяняліся. Тыя піражкі ілі два ілі адзін адносіць. Там лавачка такая ёсь. Там жа былі зрубчыкі, куды-нібудзь на вугал яна лажыла» (в. Бабічы). У Краснапольскім р-не ўзгадваюць пра хрышчэнне ў крыніцы дзетак у час, калі не было цэркваў. Аднак і сёння ў святочныя дні ля крыніц адбываецца хрост, прыкладам, у дзень святога Іллі ва Ушацкім р-не.

Персанальнае наведванне крыніцы, як правіла, больш гібкае, да яе ходзяць зусім з будзённымі патрэбамі – набраць чыстай вады або папросту папіць, пастаяць побач. Пры надзвычайных патрэбах, хваробе чалавек стараецца ісці адзін, без пышных цырымоній, але са шчырымі словамі просьбы ці падзякі.

Сёння нярэдка мы назіраем чыста спажывецкае стаўленне, якое не мае нічога супольнага з сапраўдным шанаваннем крыніц. Давайце ставіцца да іх з павагай, і тады яны нам адгукнуцца.